СА СВЯТАМ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА, ТАВАРЫШЫ!

НЯХАЙ ЖЫВЕ ВЯЛІКІ КАСТРЫЧНІК, ЯКІ АДКРЫЎ НОВУЮ ЭПОХУ СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ — ЭПОХУ РЭВАЛЮЦЫЙН А Г А АБНАЎЛЕННЯ СВЕТУ, ПЕРАХОДУ АД КАПІТАЛІЗМУ ДА САЦЫЯЛІЗМУ!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГОМЕЛЬСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 31 (231) | Субота, 6 лістапада 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

Савецкія вучоныя! Настойліва змагайцеся за паспяховае выкананне задач, пастаўленых XXV з'ездам КПСС! Павышайце эфектыўнасць навуковых даследаванняў, умацоўвайце сувязі навукі з вытворчасцю, дабівайцеся хутчэйшага ўкаранення навуковых дасягненняў у народную гаспадарку!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

Плакат мастака Б. Беразоўскага. Выдавецтва «Плакат». Фотахроніка ТАСС.

УПЭЎНЕНЫ ПОСТУП КАСТРЫЧНІКА

Наша Радзіма — у святочным убранні. Савецкія людзі з радасным настроем, ахопленыя палітычным і працоўным уздымам, які выкліканы рашэннямі кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС і пятай сесіі Вярхоўнага Савета СССР дзевятага склікання, рыхтуюцца ўрачыста адзначыць 59-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, стаўшай найвялікшай падзеяй сусветнай гісторыі.

Амаль шэсць дзесяцігоддзяў аддзяляюць нас ад таго дня, калі пралетарыят Расіі пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі і вялікага Леніна ўзяў уладу ў свае рукі, стварыў першую ў свеце дзяржаву працоўных.

Кастрычніцкая рэвалюцыя дала магутны штуршок сусветнаму грамадскаму развіццю, паскорыла ход рэвалюцыйнай і вызваленчай барацьбы, адкрыла новую эпоху — эпоху пераходу ад капіталізму да сацыялізму і камунізму. Сёння нельга не ўспомніць словы Уладзіміра Ільіча Леніна, які пісаў: **«...мы ўправе ганарыцца і мы ганарымся тым, што на нашу долю выпала шчасце пачаць пабудову савецкай дзяржавы, пачаць гэтым новую эпоху сусветнай гісторыі, эпоху панавання новага класа...»** (ПЗС, т. 44, стар. 148).

□

У. КАЗЛОЎ,
сакратар парткома.

□

Міжнародны камуністычны рух ператварыўся ўжо ў самую ўплывовую палітычную сілу сучаснасці. Гэта яшчэ раз было падкрэслена ў матэрыялах XXV з'езда КПСС. Ідэалы Кастрычніка ўсё больш і больш авалодваюць розумамі людзей, пабуджаюць іх да актыўнай барацьбы за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, за мір прагрэс.

Наша краіна дасягнула высокіх рубяжоў сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. XXV з'езд КПСС вызначыў новыя задачы ў барацьбе за камунізм. Ва ўсіх працоўных калектывах шырока разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў 1976 года і ўсёй дзесятай пяцігодкі ў цэлым. Кожны дзень прыносіць паведамленні аб новых выдатных пачынах, краіна даведваецца аб імёнах новых герояў працы.

Разам з усім савецкім народам, рыхтуючы дастойную сустрэчу 59-й гадавіне Вялікага Кастрычніка і настойліва змагаючыся за ажыццяўленне рашэнняў XXV з'езда Камуністычнай партыі, пэўных поспехаў дабіўся таксама наш шматтысячны калектыў вучоных, выкладчыкаў, рабочых і служачых, студэнтаў і аспірантаў. Ва ўніверсітэце няўхільна павышаецца якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, удасканальваецца выхаваўчая работа, замацоўваюцца лепшыя традыцыі. Сёння нам ёсць аб чым рапартаваць святу Вялікага Кастрычніка. У першым годзе дзесятай пяцігодкі шэсць маладых выкладчыкаў універсітэта паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі, паспяхова вялася па актуальных тэмах навукова-даследчая работа. Калектывамі кафедр выкананы аб'ём гаспадарча-дагаворных работ амаль на 600 тысяч рублёў — значна больш, чым за ўвесь мінулы год.

Як заўсёды, сваёй старанай, самаадданай працай нас тарадавалі студэнцкія будаўнічыя атрады. Мінулым летам на важнейшых аб'ектах Гомельшчыны і за яе межамі імі асвоена 1.744 тысячы рублёў капіталаўкладанняў — на 644 тысячы больш, чым прадугледжвалася заключанымі дагаворамі.

Плённым для студэнтаў быў і малы працоўны семестр, праведзены ў гаспадарках нашай вобласці на сельскагаспадарчых работах. Аб гэтым сведчаць шматлікія падзякі і граматы за вялікую дапамогу на ўборцы другога беларускага хлеба — бульбы.

Партком, рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта ворача вінішуюць увесь універсітэцкі калектыў са знамянальным святам Вялікага Кастрычніка, жадаюць вам, дарагія таварышы, новых поспехаў і творчых здабыткаў у вучобе і працы на карысць нашай любімай Радзімы!

ЛАЎРЭАТЫ ЎСЕСАЮЗНАГА КОНКУРСУ

Напярэдадні Кастрычніцкага свята ў наш універсітэт прыйшла прыемная вестка. Студэнты эканамічнага факультэта А. Галаў (навуковы кіраўнік к. э. н. А. У. Жук), Л. Аксёнава (навуковы кіраўнік к. э. н. Ю. Г. Бандарэнка) і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта І. Валкавіцкі (навуковы кіраўнік к. гіст. н., дацэнт Г. С. Еўдакіменка), М. Караткевіч (навуковы кіраўнік прафесар І. Ф. Харламаў) прызнаны пераможцамі Усесаюзнага конкурсу студэнцкіх навуковых работ па прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навуках. Яны ўдастоены дыпломаў Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК ВЛКСМ.

Усяго ад нашага універсітэта на Усесаюзны конкурс было паслана 74 студэнцкія даследаванні. Аўтары некаторых з іх рэкамендаваны для заахвочвання ў ГДУ.

У кастрычніку 220 навуковых студэнцкіх прац адпраўлена на рэспубліканскі конкурс. Варта сказаць і аб тым, што сёлета ў друку апублікавана каля 50 студэнцкіх навуковых артыкулаў.

М. САМУСЁНАК,
начальнік студэнцкага канструктарскага бюро.

УШАНАВАННЕ ЮБІЛЯРА

Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета ўніверсітэта. На гэты раз яно пачалося з ўрачыстасці. Члены Вучонага савета ад імя ўсяго ўніверсітэцкага калектыву горача віншавалі рэктара прафесара, члена-карэспандэнта АН БССР Б. В. Бокуця з 50-годдзем з дня яго нараджэння і ўзнагароджаннем Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Пра жыццёвы і навукова-педагагічны шлях Б. В. Бокуця расказаў сакратар парткома У. В. Казлоў. Пасля віншавальных слоў ён уручыў юбіляру памятны падарунак — інкруставаную кнігу з памятным адрасам.

Высокую ўзнагароду — Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Б. В. Бокуцю ўручыў сакратар абкома КПБ С. П. Бабыр.

Ад імя фізічнага факультэта, дзе Барыс Васільевіч загадвае кафедрай оптыкі, яго горача віншавала з юбілеем сакратар партбюро Т. П. Жалонкіна.

Ва ўрачыстай абстаноўцы юбіляру былі ўручаны памятныя адрасы ад філіяла Інстытута матэматыкі АН БССР, усіх факультэтаў універсітэта. Была ўручана таксама Ганаровая грамата Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, якой Б. В. Бокуць узнагароджан у сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння і за плённую навукова - педагагічную працу.

Б. В. Бокуця з юбілеем павіншавалі ў дасланых тэлеграмах міністр Мінвуза БССР М. М. Мяшкоў, вядомыя беларускія пісьменнікі Пятрусь Броўка, Іван Шамякін, Максім Танк, Андрэй Макаёнак, Барыс Сачанка, Анатоль Вярцінскі, Іван Чыгрынаў, Пятрусь Макаль, супрацоўнікі і сакратар аддзела фізіка - матэматычных навук АН БССР акадэмік Ф. І. Фёдараў.

У гэты дзень юбіляру было ўручана шмат кветак.

На пасяджэнні Вучонага савета прагучалі ўсхваляваныя словы Барыса Васільевіча Бокуця. Ён шчыра падзякаваў за ўсе віншаванні з нагоды яго юбілею, запэўніў, што і ў далейшым не пашкадуе сваіх сіл для плённай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

* * *

На пасяджэнні Вучонага савета былі разгледжаны вынесеныя на яго парадак дня пытанні. Начальнік вучэбнага аддзела А. К. Каваленка выступіў са справаздачай аб выніках абароны дыпломных работ і здачы дзяржаўных экзаменаў у 1975/76 навучальным годзе.

Старшыня навуковыя супрацоўнікі універсітэта інфармавалі Вучоны савет аб праведзенай імі за год рабоце.

На вакантныя і займаемыя пасады перавыбраны і выбраны прафесарска - выкладчыцкі састаў.

ПРЫСВЕЧАНЫ КАСТРЫЧНІЦКАМУ СВЯТУ

Сёння ў актавай зале ўніверсітэта адбудзецца святочны вечар, прысвечаны 59-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У праграме — урачыстая частка і канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Уваход па запрашальных білетах. Пачатак вечара — у 19 гадзін 30 мінут.

* * *

7 лістапада калектыў ўніверсітэта прыме ўдзел у святочнай дэманстрацыі. Збор —з 10 гадзін раніцы па факультэтах.

ЗНАЁМІЦЬ КНІЖНАЯ ВЫСТАЎКА

Дзвюм знамянальным датам — Дню нараджэння камсамола і 59-й гадавіне Вялікага Кастрычніка прысвечана выстаўка літаратуры, аформленая бібліятэкай універсітэта і адкрытая каля чытальнай залы ў галоўным корпусе.

У першым раздзеле выстаўкі — «Вялікаму Кастрычніку — 59» шырока прадстаўлены матэрыялы аб Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Тут і артыкулы з грамадска-палітычных часопісаў «Агитатор», «Политическое самообразование», «Коммунист», прысвечаныя 59-й гадавіне Кастрычніка і кнігі: праца М. Сяпанава «Партыя бальшавікоў у Кастрычніцкай рэвалюцыі», «КПСС у барацьбе за перамогу Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі», іншыя матэрыялы.

ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКІМ ВУЧЭННЕМ, ДАСЯГНЕННЯМІ НАВУКІ, ТЭХНІКІ І КУЛЬТУРЫ! ПАМНАЖАЙЦЕ СЛАЎНЫЯ РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ, БАЯВЫЯ І ПРАЦОЎНЫЯ ТРАДЫЦЫІ САВЕЦКАГА НАРОДА! БУДЗЬЦЕ Ў ПЕРШЫХ РАДАХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ РАШЭННЯЎ XXV З'ЕЗДА КПСС! (З Заклікаў ЦК КПСС).

УСЕСАЮЗНЫ АГІТПАХОД СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Усесаюзныя агітпаходы студэнцкай моладзі зацвердзіліся як эфектыўная форма прыцягнення студэнтаў да грамадска-палітычнай практыкі, актыўнай агітацыйна-прапагандысцкай і культурна-масавай работы. За гады 9-й пяцігодкі ў агітпаходзе прыняло ўдзел звыш 2,5 мільёна чалавек.

Вялікую агітацыйна-прапагандысцкую, культурна-масавую і шэфскую работу сярод насельніцтва правялі члены студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Усесаюзны агітпаход студэнцкай моладзі — гэта масавы патрыятычны рух, накіраваны на правядзенне разнастайнай агітацыйна-прапагандысцкай, культурна-масавай і шэфскай работы савецкага студэнцтва сярод насельніцтва.

УДЗЕЛЬНІКІ ЎСЕСАЮЗНАГА АГІТПАХОДУ

Удзельнікамі Усесаюзнага агітпаходу могуць быць студэнты, якія добра вучацца, слухачы школ маладога лектара, факультэтаў грамадскіх прафесій, удзельнікі конкурсаў па грамадскіх навуках, гісторыі ВЛКСМ і міжнароднага маладзёжнага руху, члены калектываў мастацкай самадзейнасці і іншых творчых аб'яднанняў студэнтаў, а таксама выкладчыкі і аспіранты вышэйшых навучальных устаноў.

АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ УСЕСАЮЗНАГА АГІТПАХОДУ

Усесаюзны агітпаход з'яўляецца састаўной часткай сістэмы грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў і ўключае наступныя напрамкі:

— прапаганда сярод насельніцтва поспехаў унутранай і знешняй палітыкі КПСС і Савецкага ўрада, дасягненняў нашага народа ў камуністычным будаўніцтве, грамадска-палітычных, эканамічных, навукова-тэхнічных і іншых ведаў;

— умацаванне сувязей з рабочым класам і калгасным сялянствам, выхаванне студэнцкай моладзі на гераічных, рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях савецкага народа; шэфская дапамога студэнтаў сярод рабочай, вясковай, армейскай і вучнёўскай моладзі;

— ідэйна-эстэтычнае выхаванне рабочай і вясковай моладзі, культурна-масавая работа сярод насельніцтва, барацьба сродкамі мастацкай самадзейнасці з парушэннямі працоўнай дысцыпліны, норм сацыялістычнага агульнажыцця, камуністычнай маралі.

КІРАЎНІЦТВА І АРГАНІЗАЦЫЯ ЎСЕСАЮЗНАГА АГІТПАХОДУ

Асноўным падраздзяленнем Усесаюзнага агітпаходу студэнцкай моладзі з'яўляецца агіткалектыў, састаў, праграма і план работы якіх зацвярджаюцца адпаведнымі штабамі.

Кафедры грамадскіх навук ВНУ, аддзяленні таварыства «Веды» распрацоўваюць і зацвярджаюць тэматыку лекцый для ўдзельнікаў агітпаходу.

Вузаўскія штабы агітпаходу плануюць работу агіткалектываў вышэйшай навучальнай установы, заключаюць дагаворы аб творчым супрацоўніцтве з прадпрыемствамі, калгасамі і саўгасамі, праводзяць аглядыконкурсы агітбрыгад.

Усесаюзны агітпаход студэнцкай моладзі праводзіцца круглагадова, пры гэтым:

— на працягу навучальнага года арганізуецца актыўная лекцыйна-прапагандысцкая, культурна-масавая і шэфская работа студэнтаў сярод насельніцтва па месцу знаходжання навучальнай установы;

— у час зімніх канікулаў арганізуюцца выезды студэнцкіх калектываў у падшэфныя саўгасы і калгасы;

— у час летніх канікулаў арганізуюцца выезды студэнцкіх агіткалектываў па маршрутах, распрацаваных Цэнтральным, рэспубліканскімі, краявымі і абласнымі штабамі Усесаюзнага агітпаходу.

Актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні Усесаюзнага агітпаходу ў час летніх канікулаў прымаюць агітбрыгады студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Лепшыя ўдзельнікі агітпаходу за актыўную агітацыйна-прапагандысцкую, культурна-масавую работу могуць быць прадстаўлены да ўзнагарод ЦК ВЛКСМ, ВЦСПС, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, Міністэрства культуры СССР, Усесаюзнага таварыства «Веды».

НА КАНФЕРЭНЦЫІ Ў ТАРТУ

22—28 кастрычніка ў эстонскім горадзе Тарту праходзіла І-я студэнцкая канферэнцыя па гуманітарных і прыродазнаўчых навуках вышэйшых навучальных устаноў Прыбалтыкі і Беларусі. І хаця яна намячалася як занальная, у ёй прынялі ўдзел прадстаўнікі ВНУ Вільнюса, Рыгі, Мінска, Гомеля, Пскова, Днепрадзяржынска, Яраслаўля, Варонежа, Ташкента.

Арганізацыйны камітэт Тартускага дзяржаўнага ўніверсітэта правёў вялікую арганізацыйную работу, дзякуючы чаму канферэнцыя прайшла вельмі зладжана і арганізавана. Працавалі секцыі грамадскіх навук, біялогіі і геаграфіі, фізікі, хіміі, матэматыкі, філалагічных і юрыдычных навук. Удзельнікі канферэнцыі заслухалі 156 дакладаў, 47 з якіх прачыталі госці ТДУ.

У канферэнцыі прынялі ўдзел 8 студэнтаў нашага ўніверсітэта: М. Далгіх, А. Сычоў, Ю. Ільёў з эканамічнага факультэта, Л. Сіманава — з механіка - матэматычнага, В. Дзенісенка і Т. Бокуць — з біялагічнага, Т. Карсакова, Я. Хацяновіч — з гісторыка-філалагічнага. Шэсць прачытаных імі дакладаў былі адзначаны граматамі.

Выкладчыкі і студэнты Тартускага дзяржаўнага ўніверсітэта праявілі сябе гасцінными гаспадарамі. Для дэлегатаў канферэнцыі яны арганізавалі экскурсію па горадзе, у час якой мы змаглі падрабязна азнаёміцца з гістарычнымі і памятнымі мясцінамі г. Тарту. Гэты гасцінны старажытны горад усе ўдзельнікі канферэнцыі пакідалі з самымі прыемнымі ўражаннямі:

Я. ХАЦЯНОВІЧ,
студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта, удзельніца канферэнцыі.

На здымку: студэнты ГДУ разам з эстонскімі сябрамі ў час экскурсіі па Тарту.

Фота **М. Далгіх.**

Справаздачы і выбары ў камсамоле

ЦІКАВЫМ ЖЫЦЦЁМ

Штогод на справаздачна-выбарных сходах камсамольцы падводзяць вынікі праведзенай работы, даюць ёй аб'ектыўную ацэнку, вызначаюць планы і задачы на будучае.

Па-дзелавому падышло да падрыхтоўкі і правядзення свайго справаздачна-выбарнага сходу камсамольскае бюро механіка-матэматычнага факультэта.

На сходзе са справаздачным дакладам выступіла сакратар камсамольскай арганізацыі Людміла Сіманава. Яна адзначыла, што за справаздачны перыяд на факультэце праводзілася шмат цікавых мерапрыемстваў: абмен камсамольскіх дакументаў, Ленінскі залік, месячнік прававой прапаганды «Ні адзін студэнт факультэта не застаўся ў баку і ад падрыхтоўкі і правядзення традыцыйных «Дзён мехмата». — падкрэсліла Л. Сіманава. — Па ўсеагульнаму прызнанню свята атрымалася самым цікавым за ўсе гады існавання факультэта».

Крытычныя заўвагі выказаны ў адрас факультэцкага агенцтва друку за дрэнна наладжаную работу. Сур'ёзныя прэтэнзіі прагучалі і да членаў вучэбна-выхаваўчай камісіі. Сакратар бюра ЛКСМБ мехмата ў сваім дакладзе ўнесла канкрэтныя прапановы па паляпшэнню работы ў гэтых напрамках.

У спрэчках па дакладу выступілі камсамольскія актывісты Л. Сусло, В. Бародзіч, Ю. Хадорыч, І. Абаліннік, У. Дзенісенка і інш. Яны ўсебакова прааналізавалі работу камсамольскай арганізацыі факультэта, далі станоўчую ацэнку дзейнасці бюро.

Сход пастанавіў лічыць работу камсамольскага бюро за справаздачны перыяд здавальняючай. Абрана новае бюро ў саставе 13 чалавек. На першым пасяджэнні сакратаром камсамольскай арганізацыі механіка-матэматычнага факультэта абрана студэнтка 3-га курса Ірына Сіманава.

С. БАДРУНОЎ,
намеснік сакратара бюро ЛКСМБ мехмата.

НАВУКОВЫ ГУРТОК ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Многія студэнты эканамічнага факультэта займаюцца навуковай працай. Яна дапамагае ім набываць трывалыя веды і лепш авалодваць абранай спецыяльнасцю. Прыклад са сваіх старэйшых таварышаў бяруць першакурснікі. З самага пачатку вучобы ва ўніверсітэце яны таксама становяцца актыўнымі членамі навуковых гурткоў.

На гэтым тыдні пачаў сваю работу студэнцкі навуковы гурток першакурснікаў пры кафедры палітэканоміі. На яго першым пасяджэнні перад студэнтамі выступілі загадчык кафедры палітэканоміі кандыдат эканамічных навук, дацэнт М. М. Маёраў, к. э. н., дацэнты В. Ф. Бондараў і У. Ц. Смірноў. Яны расказалі аб сваім шляху ў навуку, далі вычарпальныя адказы на шматлікія пытанні членаў гуртка.

Затым У. Ц. Смірноў прачытаў студэнтам даклад «Павышэнне ролі эканамічнай навукі ў структуры эфектыўнага сацыяльна - эканамічнага дзеяння».

На пасяджэнні гуртка былі вырашаны арганізацыйныя пытанні: зацверджаны план работы, абраны старасты.

С. НЕБЫШЫНЕЦ,
студэнт групы О—12, член гуртка.

САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ

ВЯЛІКАЯ ЗАВАЁВА САЦЫЯЛІЗМУ

XXV з'езд КПСС значна дапоўніў разуменне вышэйшай мэты сацыяльна-эканамічнай палітыкі партыі. Цяпер размова ідзе не проста аб павышэнні матэрыяльнай забяспечанасці і культурнага ўзроўню савецкіх людзей, а аб стварэнні ўсяго комплексу умоў, «што садзейнічае фарміраванню новага чалавека, усебаковаму развіццю асобы, удасканаленню сацыялістычнага ладу жыцця». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС, с. 40).**

Сканцэнтраванне ўвагі партыі і ўсяго савецкага народа на больш складаных сацыяльных задачах фарміравання сацыялістычнага ладу жыцця ні ў якім выпадку нельга разглядаць фармальна, як простае ўзбагачэнне фармулёўкі вышэйшай мэты. Гэта якасна новы этап сацыялізацыі чалавека ва ўмовах развітога сацыялізму.

—2—

Для выканання такой задачы ёсць усе умовы, і перш за ўсё сацыяльна-эканамічныя. «Неабходна аднак, — адзначыў у Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду партыі Л. І. Брэжнеў, — каб рост матэрыяльных магчымасцей пастаянна суправаджаўся павышэннем ідэйна-маральнага і культурнага ўзроўню людзей. Інакш мы можам атрымаць рэцыдывы мяшчанскай, дробнабуржуазнай псіхалогіі. Гэтага нельга выпускаць з-пад увагі. Чым вышэй падымаецца наша грамадства ў сваім развіцці, тым больш нецярпімымі становяцца адхіленні ад сацыялістычных норм маралі, якія яшчэ сустракаюцца. Скнарнасць, прыватнаўласніцкія тэндэнцыі, хуліганства, бюракратызм і абыякавасць да чалавека супярэчаць самой сутнасці нашага ладу. У барацьбе з падобнымі з'явамі неабходна ў поўнай меры выкарыстоўваць і меркаванне працоўнага калектыву, і крытычнае слова друку, і метады пераканання, і сілу закона — усе сродкі, якія знаходзяцца ў нашым распараджэнні». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС, с. 78).**

Клопаты партыі аб фарміраванні сацыялістычнага ладу жыцця выкліканы таксама неабходнасцю ўзмацнення барацьбы з ілжывымі каштоўнасцямі буржуазнага ідэалу ў ладзе жыцця, асабліва шырока рэкламіруючагася амерыканскага і заходняга. Больш высокія патрабаванні да ідэалагічнай работы, да прапаганды ва ўмовах разрадкі паставіў кастрычніцкі Пленум ЦК КПСС (1976 г.)

Паняцце сацыялістычнага ладу жыцця шырокае і параўнальнае з такімі катэгорыямі, як

—3—

грамадства, спосаб вытворчасці. Вызначэнне сацыялістычнага ладу жыцця нельга падвесці пад больш шырокае родавае паняцце з выдзяленнем відавых адрозненняў. Магчыма толькі ўсведамленне яго багатага зместу праз выдзяленне і сістэматызацыю ўнутраных, істотных рыс і прыкмет сацыялістычнага ладу жыцця, такіх, як уклад жыцця, якасць і ўзровень жыцця, стыль і эталон жыцця, ідэалы і вышэйшыя каштоўнасці жыцця. Прычым, заўсёды трэба памятаць аб спецыфічна гістарычным характары ладу жыцця і яго канкрэтным праяўленні ў жыццядзейнасці кожнага чалавека.

Пад сацыялістычным ладам жыцця мы разумеем **спецыфічна гістарычны лад жыцця канкрэтнага чалавека, які характарызуецца пэўнай якасцю і ўзроўнем жыцця і забяспечвае дастатковa ўстойлівы стыль паводзін, арыентаваны на дасягненне сацыялістычных ідэалаў правільнага шчаслівага жыцця.** У гэтым вызначэнні, на наш погляд, спалучаюцца важнейшыя рысы і бакі ладу жыцця пры сацыялізме.

Уклад жыцця кожнага канкрэтнага чалавека вызначаны пануючымі сацыялістычнымі грамадскімі адносінамі з аднаго боку, і іх усведамленнем і рэальным пераламленнем у паўсядзённай жыццядзейнасці з боку канкрэтнага індывіда. Выражаючы гістарычную спецыфіку ладу жыцця, уклад жыцця разам з тым адлюстроўвае разнастайнасць аб'ектыўных і суб'ектыўных умоў жыццядзейнасці індывіда.

Менавіта ўклад усяго нашага сацыялістычнага жыцця характарызуе новую якасць жыцця са-

УРУЧАНЫ СТУДЭНЦКІЯ «МАНДАТЫ»

Гэты дзень надоўга застанецца ў памяці нашых першакурснікаў. Ва ўрачыстай абстаноўцы дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Т. І. Язэпава ўручала юнакам і дзяўчатам заліковыя кніжкі і студэнцкія білеты. Асабліва хвалявалася тыя, хто займаўся на падрыхтоўчым аддзяленні, летам быў байцом будаўнічага атрада.

Вось упэўнена падымаецца на сцэну былы воін, камісар будатрада «Таварыш», цяпер староста групы, парторг курса Уладзімір Канаплкоў. За ім ідуць Анатоль Цюрын, мастак атрада і староста групы, Васіль Мікалаенка, Валянціна Лукашэвіч.

Не менш нас хваляваліся нашы малодшыя сябры, для якіх гэты год быў таксама экзаменам на сталасць.

Перад намі выступілі лепшыя студэнты нашага факультэта: дэпутат гарадскога Савета дэпутатаў працоўных Уладзімір Гаркуша, ленінская стыпендыятка Міла Беразоўская, сакратар бюро ЛКСМБ факультэта Міхаіл Абраменка. Яны павіншавалі нас з уступленнем у дружную студэнцкую сям'ю, далі каштоўныя парады, як лепш рыхтавацца да семінарскіх заняткаў, залікаў і экзаменаў.

Студэнцкі білет і заліковая кніжка — нашы спадарожнікі на працягу пяці гадоў вучобы ва ўніверсітэце. Гэта наша сумленне, чалавечая годнасць. І мы будзем старацца вучыцца так, каб у залікоўцы з'явіліся толькі добрыя і выдатныя адзнакі.

Старшыня таварышы пажадалі нам: «У добры час, першакурснік!».

Г. КАРНАЧ,
студэнтка групы Б-13 гісторыка-філалагічнага факультэта.

ТАЛЕНТЫ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

ЗДОЛЬНАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Традыцыі, традыцыі... Іх шмат на нашым факультэце. І амаль з першага дня вучобы ва ўніверсітэце першакурснікі знаёмяцца з імі. На працягу пяці гадоў ім прадстаіць прадаўжаць і памнажаць гэтыя традыцыі. Самая першая і, бадай, самая цікавая і вясёлая з іх — правядзенне конкурсу «Ану, першакурснік!». Яго заўсёды чакаюць з нецярплівасцю студэнты старэйшых курсаў, каб пазнаёміцца з новымі талентамі, што папоўняць рады ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці факультэта, універсітэта. А першакурснікі рыхтуюцца да агляду-конкурсу з асаблівай стараннасцю і, безумоўна, хвалююцца.

І вось доўгачаканы дзень прыйшоў. Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка ў актавай зале ўніверсітэта першакурснікі эканамічнага факультэта дэманстравалі сваё майстэрства.

З добрай усмешкай, вясёлай песняй, жывым гумарам выступілі на конкурсе рабяты з групы 0—12.

Нечаканай і прыемнай знаходкай з'явілася выступленне майстра спорту па мастацкай гімнастыцы студэнткі групы 0—12 Марыны Макаравай.

Усіх гледачоў і строгае журы пакарыў добры і ласкавы голас-першакурсніцы Ірыны Андрыянавай. Яна стала лаўрэатам конкурсу «Ану, першакурснік!» і атрымала прыз, устаноўлены студэнта групы 0—12. Гэтаму юнаку ўдалося развесяліць усіх, нават непрыступнае ў сваёй строгасці журы.

Калі конкурс закончыўся, гледачы доўга і дружна апладыравалі ўсім яго ўдзельнікам, радуючыся таму, што сярод новага папаўнення факультэта ёсць нямала сапраўды таленавітых самадзейных артыстаў.

Л. ЗАЛУЖНАЯ,
член журы конкурсу, студэнтка групы 0—21 эканамічнага факультэта.

На здымках: 1. Танцуюць Ніна Чурак і Анатоль Нікулін. 2. Група 0—12 — пераможца конкурсу.
Фота А. Мажарава.

СТАЛІ ПЕРАМОЖЦАМІ

У МІНУЛУЮ суботу ў актавай зале, як кажуць, яблыку не было дзе ўпасці. Ішоў агляд-конкурс мастацкай самадзейнасці факультэтаў «Ану, першакурснік!».

Гісторыка - філалагічны факультэт выдзеліў для ўдзелу ў конкурсе лепшых з лепшых першакурснікаў, якія аказаліся „пераможцамі агляду талентаў паміж групамі.

Зала ўважліва сачыла за кожным рухам Наташы Курбан. Яна з вялікім майстэрствам выконвала рускі танец. Усім спадабаліся прыпеўкі з жыцця студэнтаў, якія праспявалі А. Цюрын і А. Собчанка.

Наташа Прохарава даўно сябруе з баянам. Да паступлення на вучобу ва ўніверсітэт яна закончыла культ-прасветвучылішча. Ансамбль пад яе кіраўніцтвам выканаў песні пра настаўніка, «Деревенька моя». Калі мы слухалі задушэўныя песні, у думках пераносіліся далёка - далёка: за родную ваколіцу, дзе не раз сустракалі світанак, слухалі шэпт вербалозу і плёскат хваль невялікай рачулкі.

Як сапраўдныя артысты, трымаліся на сцэне Валянціна Лукашэвіч і Галіна Петрушэнка. Яны спявалі цыганскія песні, акампануючы сабе на гітары.

У зале цішыня. Потым усё больш мацнеюць гукі раяля. Гэта Ала Селівончык дарыць сябрам песню «Королева и шут».

...Гітара! Вечны спадарожнік рамантыкаў, добрая сяброўка студэнтаў. У цяжкія хвіліны яна многім вяртала сілы, узнімала на барацьбу, вяла ў бой. Многа паведаміла яна ў руках Уладзіміра Калюбаева.

На высокім узроўні вялі конкурсную праграму факультэта Міхаіл Космыкаў і Людміла Краўчанка.

Заціх апошні акорд. Агляд талентаў першакурснікаў закончыўся. Журы прысудзіла першае месца гісторыка - філалагічнаму факультэту.

Г. НІКАЛАЕВА.

10 ЛІСТАПАДА — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ МІЛІЦЫІ

НА ВАРЦЕ ПАРАДКУ

59 гадоў служыць народу, нашай дзяржаве савецкая міліцыя. Яна стаіць на варце сацыялістычнай уласнасці, праў і законных інтарэсаў грамадзян, прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, падтрымлівае грамадскі парадак, забяспечвае поўнае і своечасовае раскрыццё злачынстваў. Створаная на трэці дзень перамогі Кастрычніка па ініцыятыве У. І. Леніна, савецкая міліцыя прайшла вялікі гераічны шлях. Цяперашняе пакаленне яе работнікаў свята захоўвае і працягвае слаўныя традыцыі герояў рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, ударнікаў сацыялістычнага будаўніцтва і абаронцаў Айчыны ў гады бітваў з фашызмам. Камуністычная партыя і Савецкі ўрад удзяляюць вялікую ўвагу ўмацаванню правапарадку і сацыялістычнай законнасці, пастаянна клапоцяцца аб органах міліцыі, росце яе аўтарытэту, строга кантралююць яе дзейнасць. Абапіраючыся на савецкія законы, рашэнні партыі і ўрада, савецкая міліцыя вядзе ўпартую барацьбу са злачынствам, п'янствам і алкагалізмам, з усялякімі антыграмадскімі з'явамі. Генеральная лінія яе дзейнасці накіравана на прадухіленне правапарушэнняў. У яе нялёгкай і часта небяспечнай працы значную дапамогу міліцыі аказваюць працоўныя калектывы, актывісты, народныя дружыны, аператыўныя камсамольскія атрады і іншыя грамадскія арганізацыі. З кожным годам удасканальваецца дзейнасць усіх служб міліцыі, працягваецца аснашчэнне яе сучаснымі сродкамі сувязі, сігналізацыі, транспарту, аператыўна - крыміналістычнай тэхнікі. Расце ідэйна-палітычны і прафесійны ўзровень падрыхтоўкі міліцэйскіх кадраў. У Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду партыі была дана высокая ацэнка дзейнасці савецкай міліцыі, указаны шляхі яе далейшага ўдасканальвання. Выкананне пастаўленых XXV з'ездам КПСС сацыяльна-эканамічных задач у многім залежыць ад эфектыўнай работы органаў унутраных спраў. Разумеючы гэта, работнікі міліцыі самаадданай працай адказваюць на клопаты партыі аб дабрабыце народа, аб працвітанні Радзімы, уносяць свой уклад у справу будаўніцтва камунізму.

—4—

вецкага чалавека ва ўсёй разнастайнасці і шматквецці рыс і прыкмет. Якасны бок сацыялістычнага ладу жыцця мы раскрываем з боку **сэнсу жыцця** або **ідэалу шчасця,** які заключаецца для камуністаў, камсамольцаў, усіх свядомых працоўных нашай краіны **ў барацьбе за пабудову камунізму,** грамадства працы, міру, свабоды, роўнасці і братэрства ўсіх людзей.

Галоўнай сферай жыццядзейнасці, «лепшай часткай нашага жыцця», па вызначэнню У. І. Леніна, асноўным сродкам самазацвярджэння асобы пры сацыялізме з'яўляецца **свабодная творчая праца,** заснаваная на свядомай дысцыпліне, на добрасумленных адносінах да даручанай справы, якая развівае калектывізм, сучаснае працоўніцтва і ўзаемадапамогу, сцвярджае арганічнае адзінства грамадскіх, калектыўных і асабістых інтарэсаў, мэт.

«Праца ёсць адзіна даступнае чалавеку на зямлі і адзіна вартае яго шчасце», — пісаў вялікі педагог К. Д. Ушынскі. Але гэта шчасце не можа прынесці праца рабская, падняволная і наёмная. Толькі свабодная праца на сябе і ўсё грамадства забяспечвае гуманізацыю свайго зместу і формы. Такі ідэал працы ўсталёўвае сацыялізм. Ён супрацьлеглы буржуазнай працы дзеля ўзбагачэння.

Якой горыччу напоўнены словы французскага пісьменніка Антуана дэ Сент-Экзюперы, паказаўшага бессэнсоўнасць і бесчалавечнасць буржуазнага характару працы. «Працуючы толькі дзеля матэрыяльнага дабрабыту, мы самі сабе будуем турму. І замыкаемся ў адзіноце, і ўсе нашы

—5—

багацці — прах і попел, яны бяссільныя прынесці нам тое, дзеля чаго варта жыць». У тэтай «турме» адчужанай, дэгуманізаванай працы жывуць яшчэ сотні мільёнаў працоўных капіталістычнага свету. І згладзіць турэмнае існаванне не могуць аўтамабілі, кватэры, адзенне, любая матэрыяльная перанасычанасць.

Сацыялістычная якасць жыцця характарызуецца таксама правільнымі каштоўнымі арыентацыямі і ўстаноўкамі.

Прыгадаем грознае папярэджанне М. Горкага: «Мяшчанства — гэта паўзучая расліна. Яна здольна бясконца размнажацца і жадала б задушыць свазімі парасткамі ўсё на сваёй дарозе... Яно пажырае асобу знутры, як чарвяк спусташае скарб... Яно — бяздонна прагная багна грязі, якая засмоктвае ў ліпучую глыб сваю генія, каханне, думку, навуку і мастацтва».

Прывіццю і замацаванню чалавечых каштоўных арыентацый служыць выхаванне патрабаванняў, правільная палітыка даходаў і спажывання.

Нарэшце, якасць жыцця праяўляецца ў жыццёвай пазіцыі чалавека. «Нічога так не ўзвышае асобу, — адзначаў на XXV з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў, — як актыўная жыццёвая пазіцыя, свядомыя адносіны да грамадскага абавязку, калі адзінства слова і справы становяцца паўсядзённай нормай паводзін». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС, с. 77).** Сацыялізм адмаўляе буржуазны індывідуалізм і эгаізм. Чалавек чалавеку — сябар, таварыш і брат —непарушны прынцып міжасабовых адносін пры сацыялізме.

—6—

Актыўная жыццёвая пазіцыя чалавека ў грамадстве, калектыве вызначае той узровень жыцця, якога ён дасягнуў. Б'ецца гэты чалавек у цянётах буржуазных перажыткаў дармаедства, прыватнаўласніцкіх тэндэнцый, мяшчанскай абывацельшчыны, антыграмадскіх эгацэнтрысцкіх паводзін, або гэта актыўны, свядомы будаўнік новага жыцця, які ўдасканальваецца ў працы на агульную карысць, не чужы чалавечым захапленням і жыве ў дастатку, але не выключна дзеля гэтага дастатку, развіваючы багатую гаму сацыяльных і духоўных інтарэсаў. Такія граничныя ўзроўні сацыялістычнага ладу жыцця. Ад асабістых намаганняў кожнага, ад правільнай комплекснай выхаваўчай работы ў адзінстве працоўнага, палітычнага і маральнага выхавання, залежыць няўхільнае ўцягненне на вышэйшы ўзровень сацыялістычнага ладу жыцця ўсё большых мас насельніцтва краіны.

Дадзенае палажэнне перш за ўсё адносіцца да выхавання моладзі, будучых гаспадароў камуністычнага грамадства. Не марненне, не існаванне і проста жыццё, а творчае прыванне, энтузіязм і гарэнне павінны адрозніваць лад жыцця кожнага камсамольца, кожнага маладога чалавека. «Мы хочам, — заключаў сваё слова аб камсамоле на XXV з'ездзе КПСС Л. І. Брэжнеў, — каб энтузіязм, жывасць розуму, маладая энергія заставаліся ў нашых людзей на ўсё жыццё. Гэтаму павінен садзейнічаць камсамол, гэта павінна быць яго важнай работай». **(Матэрыялы XXV з'езда КПСС, с. 85).**

У. СМІРНОЎ,
дацэнт кафедры палітэканомії.

На паэтычнай арбіце

Аляксандр Дуброўскі і Сямён Шыкун у гады вучобы ва ўніверсітэце прымалі актыўны ўдзел у рабоце літаратурнага аб'яднання «Крыніца». Іх вершы неаднаразова змяшчаліся ў нашай шматтыражцы. Закончыўшы ўніверсітэт, першы з іх працуе зараз у рэдакцыі гомельскай раённай газеты «Маяк», другі — настаўнічае ў вячэрняй школе г. Светлагорска. Але маладыя паэты не парываюць сувязі з літаб'яднаннем, дзе зрабілі свае першыя крокі ў паэзію.

Сёння мы прапануем увазе чытачоў іх новыя вершы.

Аляксандр ДУБРОЎСКІ

НА ПАРОМЕ

У паромшчыцы — косы русыя,
Стройны стан, як цаўё вясла...
Заглядзеўся шафёр бязвусы,
А машына ў кювет нясла.
Ледзь стрымаў яе на абочыне,
Прыпыніў перавесці дух.
А ў дзяўчыны твар заклапочаны:
«Замінаеш ты, хлопец, рух!»

Зноў крануўся, сенам нагружаны,
Грузавік, як вялізны дом.
Зарыпелі масткі напружана,
Аж асеў у ваду паром.
Хлопец выйшаў з кабіны спешна:
Сам высокі і хваляй чуб.
Скалыхнуўся цёплай усмешкаю
Яркі банцік дзявочых губ.
Абмяняліся толькі фразамі—
У дваіх развязалі канат...
Ну, а Сож зразумеў адразу іх,
Як бывалы і кемлівы сват.

НА СЕНАЖАЦІ

У руках — антонаўка,
на зубах — аскома,
У вачах жа — сонейка
і святая стома.
Скінула касыначку,
распусціла косы
І пайшла бярэзнічкам
стройная і босая.
Смага неадольная
днём на касавіцы —
Спрытна нахілілася
над жывой крыніцай.
Зачарпнула прыгаршні,
паднесла да вуснаў,
І вада студзёная
вельмі ёй па густу.
Напілася дзеванька,
нібы соку з клёна,
Заскакалі конікі
ў вачах зялёных.

Семен ШИКУН

* * *

Легко сказать, что в сентябре,
Как яблоки, круглее даты,
И больше времени в обрез,
И ты не требуешь награды...
Но этот дом и этот двор,
Разлук моих сгущая краски,
Ночами с некоторых пор
Меня пугает для отстрастки.
Пугает, чтобы не присох
К другим полям на месяц, на год,
Где лист летит, как волосок,
С такой же болью и отвагой!
Я взгляд на слово нанизал,
Но ты не та, не та, что раньше,
У той продрогшие глаза
И рук глухое пониманье!
Листочек жёлтый сентября
За нами задыхался следом,—
Ведь не увидевши тебя,
Не началось бы бабье лето!..

(ГУМАРЭСКА)

ПА-СЯБРОЎСКУ ВЕТЛІВА

Аб тым, што ў 47-ым пакоі жывуць самыя заўзятыя гаваруны і весельчакі, у інтэрнаце ведаюць усе. Міколу Гаваркова таксама ведаюць. Як кажуць, у вясёлую мінуту нарадзіўся хлопец: што ні слова — жарт, і заўсёды трапны.

Увогуле, Гаваркоў — фантазёр. З мухі слана зробіць, толькі дай яму волю. Але ж слухаюць яго заўсёды з увагай і разыходзяцца па пакоях, калі добрая палова жыхароў інтэрната даўно спіць. Мікола ведае, што заседжваціа вельмі позна нельга, бо заўтра яго смешкі, як кажуць, бокам выйдуць — прадрэмлеш на занятках. Таму збіраюцца хлопцы да яго толькі па суботах.

І ўжо хто-хто, а Пятрусь Круцік, аднакурснік Міколы, ніколі не абміне пакоя сябра. Круцік — заядлы прагульшчык. Рабяты з вучэбна-выхаваўчай камісіі ўжо праз каторы раз не могуць затаць яго на занятках.

Калі хлопцы ўволю насмяюцца з дасціпных Міколавых жартаў і разыходзяцца па пакоях, Круцік звычайна пытаецца ў сябра:

— Дык, як там, ніхто мною не цікавіўся?

— Стараста пытаў у мяне, чаму ты трэці дзень на занятках не з'яўляешся.

— І што ты яму сказаў?

— Сказаў, што не ведаю.

— Дзівак. Не мог прыдумаць што-небудзь... На апошні выпадак сказаў бы, што я захварэў. Я ж не марную час пустаслоўем, як ты.

Мікола хацеў запярэчыць, маўляў, «пустаслоўіць» ён у вольны час, але Круцік апярэдзіў яго:

— Пазаўчора перавод грашовы ад бацькоў атрымаў. Ну, а ўчора прыкупіў таго-сяго. Вось і прайшоў час.

Зрэшты, пасля такіх размоў сябры і развітваліся. У Круціка, што ў таго Ягоркі, на прагулы заўсёды знаходзіліся адгаворкі.

Ў 47-ым пакоі ў той вечар было мнагалюдна. Аднак Гаваркоў не спяшаўся пачынаць свае жарты. Ён усё пазіраў у бок Петруся, ды загадкава ўсміхаўся. Але ж, як кажуць у народзе, цыган не можа жыць без каня, а гумарыст — без трапнага слова. Ці ж стрымае ён сябе?

— Сон сёння бачыў, — пачаў Гаваркоў. — Нібыта выклікаюць мяне ў дэканат і кажуць: будзем, Мікола, абмяркоўваць твае паводзіны на пасяджэнні вучэбна-выхаваўчай камісіі за тое, што на заняткі не ходзіш. А я ім сваё: тыдзень назад сябра дзяцінства сустрэў. Шафёр ён, прыехаў у камандыроўку ў Гомель. Вось і прыйшлося прапусціць дзень-другі. Пазаўчора — перавод грашовы ад бацькоў прыйшоў. Ці ж паспеш пасля заняткаў атрымаць яго, ды купіць што? Вось вам яшчэ дзень. Дэкан наш паслухаў мяне, ды і адпусціў з богам. Ідзі, кажа, Мікола, і не турбуйся. Прабач, што прылічылі цябе да прагульшчыкаў.

Усе смяяліся на дзіва дружна. Ведалі, у чый агарод камень кінуты. Разумеў гэта і Пятрусь. Таму і не чуваць было яго смеху.

Калі ўсе хлопцы разышліся, Круцік затрымаўся ў пакоі і спытаў у Міколы:

— Дык, якія там у нас заўтра заняткі: лекцыі, ці можа і практычныя ёсць?

А. ШВЕДАЎ.

Нина ПИНЧУК

* * *

Как солнечно в оттаявшем лесу!
Устав от чёрно-белой летаргии,
Целуются, качаясь на весу,
Деревья, по-весеннему нагие.
Тягучий сок пульсирует, как кровь.
Из памяти прогнав былую стужу,
Я к ним пришла наполнить до краёв
Весенним днём оттаявшую душу.

...І позні ліст на дрэве ацалелы,
і кропелька халодная расы
прыходзяць. як забытыя напевы,
адкрыццём неадкрытае красы...

Віктар ЯРАЦ.

Да 80-годдзя з дня нараджэння Міхася Чарота

КВЕТКА ШЧАСЦЯ БЕЛАРУСКАГА ДРАМАТУРГА

7 лістапада спаўняецца 80 гадоў з дня нараджэння выдатнага палітычнага дзеяча, паэта, празаіка, драматурга і артыста Міхася Сямёнавіча Кудзелькі (Міхася Чарота). Пачынаючы з 1921 г. і на працягу цэлага дзесяцігоддзя, натхнёная творчая праца паэта была непарыўна звязана з развіццём новай сацыялістычнай культуры беларускага народа і з'яўляецца выдатным узорам патрыятычнага служэння сацыялістычнай Радзіме.

З першых крокаў літаратурнай дзейнасці Чарот усю сілу свайго таленту, энергію і здольнасці прысвяціў змаганню за ўсталяванне новага савецкага ладу жыцця, за росквіт духоўнай культуры народа. Вершамі, паэмамі, драматычнымі творамі, прасякнутымі рэвалюцыйным пафасам, народнай мудрасцю, дасціпнасцю, гумарам, пісьменнік не толькі ўзбагаціў беларускую літаратуру, але і значна пашырыў яе жанравыя рамкі.

«Больш за ўсё люблю пісаць вершы», — шчыра прызнаваўся М. Чарот у аўтабіяграфіі. Сапраўды, паэзія займала вядучае месца ў яго творчасці. Пачынаючы з 1922 г., адна за другой выходзяць яго кнігі паэзіі —зборнікі «Завіруха», «Выбраныя вершы», «Беларусь лапцюжная», «Чырвонакрылы вяшчун», паэмы «Босыя на вогнішчы», «Карчма», «Марына», «Ленін» і інш.

Сваё паэтычнае крэда, крэда грамадзяніна Краіны Саветаў, М. Чарот вызначыў у сваім вершы «Маладому песняру», дзе ў прыватнасці гаворыць:

Я шумлівы чарот,
я мяцежны бунтар.
Я балота буджу
гучным шумам.
Уздыму дух людзей,
прабуджу іх ад сну, —
Славу, будучнасць ім
я прарочу...
Я, мяцежны бунтар,
клічу жыцця вясну,
Клічу к працы свабоднай
і творчай.

Паэзія М. Чарота, авеяная рэвалюцыйнай рамантыкай, была сапраўдным узорам пралетарскай літаратуры.

Чарот набыў шырокую папулярнасць як паэт, але не менш вядомым ён быў і як драматург. Яго — чалавека, які жыў у клопатах аб нашай нацыянальнай культуры, — не мог, вядома, не хваляваць той факт, што беларускае тэатральнае мастацтва ў першыя гады Савецкай улады адчувала рэпертуарны голад. М. Чарот добра ведаў тэатр, прымаў непасрэдны ўдзел у тэатральным жыцці: некаторы час ён быў артыстам у трупе У. Галубка, а пасля вучыўся ў тэатральнай студыі ў Маскве. У 1919—1921 гг. з'яўляюцца яго першыя драматычныя творы: п'есы для дзяцей «Данілка і Алеська» і «Пастушкі», вадэвілі «Мікітаў лапаць» і «Слуцкая варона», народная драма «На Купалле».

Дзіцячыя п'ескі «Данілка і Алеська» і «Пастушкі» — творы чыста дыдактычныя, мала выразныя па зместу. І ўсё ж першыя драматургічныя вопыты Чарота не прайшлі бясследна. Пацвярджае гэта напісаная ім камедыя-жарт «Мікітаў лапаць», у якой праявілася наследаванне маладым пісьменнікам лепшых традыцый беларускай, а таксама ўкраінскай літаратур. Твор пісаўся з разлікам на тое, каб выклікаць сімпатыі гледача да моладзі, якая старанецца знайсці сваё месца ў жыцці. Улічваючы патрабаванні жанру, пісьменнік не паглыбляе канфлікту п'есы, выстаўляе на смех асобныя адмоўныя з'явы сялянскага быту. У п'есе надзвычай яскрава выступае вадэвільны прыцыпн пабудовы сюжэта, заснаваны на непаразуменнях і супадзеннях, выпадковых супярэчнасцях, сварках, прымірэннях і любоўных калізіях. Характэрнай рысай твора з'яўляецца і тое, што сатырычная плынь тут прыглушана і выяўляецца найчасцей у жартаўлівых сцэнах і вобразах. П'еса, пранізаная атмасферай тэатральнага жарту, вяселля, жыццярадаснага гумару, была вельмі сцэнічнай.

Самым значным драматычным творам М. Чарота была музычная драма «На Купалле», цесна звязаная з народнымі традыцыямі, у якой, па словах З. Бядулі, «чулася біцце жывога сэрца народа». На жаль, тэкст драмы не захаваўся, і зместе яе вядомы толькі па пераказах і рэцэнзіях.

П'еса Міхася Чарота была пастаўлена Я. Міровічам як народная музычная драма, сінтэтычная па свайму характару. Феерычны абрад купальскай ночы, фантастычныя істоты Лясуна, Вадзяніка, Ваўкалака, чароўная музыка, напісаная на аснове народных мелодый, спляталіся ў спектаклі з сумнай гісторыяй кахання Уладзіка і Алесі. І побач з гэтым — выдатныя камедыйныя вобразы Данілкі і Параскі. Востра камедыйныя сцэны сваім кантрасным палажэннем яшчэ больш падкрэслівалі святочнасць пастаноўкі, асабліва ў сцэнах купальскай ночы. Меладраматычны сюжэт даволі добра дапасоўваўся да агульнага лірычнага настрою п'есы, да прыўзнятай святочнай яе афарбоўкі. Тое, што ў час святочных сцэн настойліва прарываліся сумныя ноты, не знікала, а яшчэ больш адцяняла лірызм спектакля.

Добрая літаратурная аснова, вопыт, здольнасці, тонкі густ рэжысёра зрабілі спектакль папраўднаму першай заваёвай беларускага тэатра. Поспех п'есы быў настолькі вялікі, што выклікаў шэраг падобных на сябе — «Купалле» С. Музыкі, «У Купалаўскую ноч» М. Грамыкі, «Вяселле» В. Гарбацэвіча, пастаўленых пазней.

У 1923 годзе на Усесаюзным сяляпскім свяце ў Маскве Беларускі драматычны тэатр — II (цяпер тэатр імя Я. Купалы) паказаў спектакль «На Купалле». Сталічныя гледачы далі высокую ацэнку і п'есе, і рабоце тэатра. Газета «Известия», у прыватнасці, пісала: «...асноўны матыў творчасці беларускага тэатра сімвалічна выказаны ў п'есе «На Купалле» ...Гэта шуканне сваёй кветкі шчасця, якім у больш шырокім разуменні жыве цяпер увесь беларускі народ».

Знайшоў сваю кветку шчасця і таленавіты беларускі пісьменнік Міхась Чарот. І не толькі ў паэзіі. Яго п'есы, якія стаяць ля самых вытокаў беларускай савецкай драматургіі, адмгралі значную ролю ў станаўленні беларускага нацыянальнага тэатральнага мастацтва.

Л. КАРАБАНАВА,
выкладчыца кафедры беларускай літаратуры.

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палеспрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Наш адрас: вул. Савецкая, 104, галоўны корпус ГДУ, П. 5-3, Т. 6-27-71. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз.

АЗ 02499

Заказ 6998